УДК 821.161.3-17

Навуч. А.А. Радкевіч
Навук. кіраўнік Н.А. Цітова, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА «Пухавіцкая сярэдняя школа»)

# ЦІ СТАЛА САТЫРА ДАМІНАНТАЙ У ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ БРЫЛЯ?

Сатырычны спосаб адлюстравання рэчаіснасці характэрны ў той ці іншай ступені для ўсіх відаў мастацтва. Аднак найбольш плённым ён аказаўся ў літаратуры.

Тэма даследчай работы: "Ці стала сатыра дамінантай у творчасці Янкі Брыля?"

Мэта: прасачыць, як мянялася стаўленне Янкі Брыля да сатыры.

Янка Брыль у беларускай літаратуры не лічыцца пісьменнікам-сатырыкам. Аднак некаторыя яго творы маюць выразную гумарыстычную афарбоўку. Гэта тэма яшчэ мала раскрыта літаратуразнаўцамі.

Здольнасць да камічнага ўспрымання з'яў навакольнага свету пачала фарміравацца ў Янкі Брыля пад уплывам народнай смехавой культуры, да якой ён быў далучаны ад пачатку свайго вясковага заходнебеларускага маленства. Яго пазіцыя супала з высновай М. Салтыкова-Шчадрына аб тым, што "адзіная глеба для сатыры ёсць глеба народная".

Гэтаю высноваю Янка Брыль кіраваўся ўжо ў самых першых сваіх літаратурных апавяданнях. Яго раннія апавяданні "Сёння "дзяды", "Праведнікі і зладзеі" маюць выразную гумарыстычную афарбоўку, аднак сатыра не выступае тут у якасці дамінанты, яна проста дапамагае расставіць дадатковыя маральныя акцэнты пры абмалёўцы вобразаў кулака Грыба ці "брата Мішы" ў "Праведніках і зладзеях".

У 1939 годзе Янка Брыль быў вымушаны пакінуць родную хату. Каб стаць салдатам польскай арміі, удзельнікам Другой сусветнай вайны, ваеннапалонным у Германіі.

Выкрыць антыгуманную сутнасць фашызму – такую мэту паставіў перад сабой пісьменнік, калі вярнуўся на Радзіму ў 1941 годзе. Таму заканамерна, што ў новых творах: "Ты мой найлепшы друг", "Жывое і гніль" – удзельная вага сатыры павялічылася.

Пасля вызвалення Беларусі пісьменнік увайшоў у рэдакцыю газеты-плаката "Раздавім фашысцкую гадзіну", дзе яго патэнцыял

сатырыка аказаўся надзвычай запатрабавальным. Пасля вайны газета-плакат была пераўтворана ў сатырычна-гумарыстычны часопіс “Вожык”. Для гэтага перыядычнага выдання былі напісаны самыя сатырычныя творы Янкі Брыля – апавяданні-фельетоны “Прывал” і “Субардынацыя”.

Здавалася б, у Янкі Брыля было дастаткова падстаў для таго, каб не развітвацца з амплуа сатырыка, а ўмацоўваць і ўдасканальваць дасягнутыя пазіцыі. Аднак усё склалася наадварот. Наступную спробу мастака ў жанры сатырычнага апавядання “Кансерватар” нельга назваць паспяховай.

У далейшым пісьменнік не захацеў канцэнтраваць свае творчыя намаганні ў галіне сатыры. Пісьменнік адчуў, што амплуа сатырыка для яго завузкае, зацікавіўся новымі задумамі. Аднак галоўная прычына была ў характэрных асаблівасцях савецкага літаратурнага працэсу.

Цэнзура патрабавала ад Янкі Брыля згушчэння цёмных фарбаў пры адлюстраванні парадкаў, заведзеных польскай урадай, паказу прадстаўнікоў улады і іх памагатых у негатыўным святле.

Янка Брыль усё больш усведамляў, што быць сатырыкам пад кіраўніцтвам партыі, ва ўмовах таталітарна-бюрактычнай сістэмы немагчыма. Такім чынам, пісьменнік адышоў ад сатыры і канчаткова сцвердзіў сябе як майстар лірычнай прозы.

Надаючы ўсё больш увагі лірычнай мікрапрозе, Янка Брыль здолеў і ў гэтай галіне знайсці ўдалае прымяненне свайму сатырычнаму майстэрству. У гэтым лёгка пераканацца, звярнуўшыся да мініяцюр “Шапка”, “Парыпванне”.

У сярэдзіне 60-х гг. Янка Брыль звяртаецца да публікацыі лірычных нататак, якія далі асабліва грунтоўныя падставы для таго, каб засяродзіць увагу на смелым наватарстве пісьменніка. У літаратурнай спадчыне Янкі Брыля склалася шмат нататкавых серый, у якіх знаходзіцца месца і для сатырычнай накіраванасці.

Некаторыя яго запісы набываюць характар афарызмаў: “Зусім розныя рэчы – салдат хоча стаць маршалам, а яфрэтар лічыць, што ён ужо генерал”, “Добра і ў старасці быць маладым”.

Сатыра не стала дамінантай у мастацкай сістэме пісьменніка, але ўсё ж заняла ў ёй сваё немалаважнае месца. На ўсіх этапах сваёй творчай дзейнасці мастак слова захоўваў перакананасць у тым, што смех можа ўплываць станоўча на свядомасць людзей. Янка Брыль аддаваў перавагу гумару, уласнасатырычных твораў у яго нямнога. Часцей за ўсё сатыра выступае ў якасці дадатковага сродку. Затое ў

лірычнай мікрапрозе пісьменніка сатырычны камізм знайшоў сваё арыгінальнае выяўленне.

## ЛІТАРАТУРА

1. Янка Брыль, Пішу як жыву. Аповесць, апавяданні, мініяцюры, эсэ, – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 363 с.
2. Брыль, Я. На сцежцы — дзеці : апавяданні, мініяцюры, эсэ / Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. – 205, [2] с.
3. Satyra w literaturach wschodnioslowianskich, VII: Studia pod redakcj^ Wandy Supy. – Biafystok 2008.

УДК 821.161.3:392.81

Навуч. А.М. Русак
Навук. кіраўнік А.А. Купіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА "Гімназія № 19 г. Мінска")

## "ДЗЕ КАША І АЛАДКА, ТАМ БУДЗЕ І АБРАДКА". ТРАДЫЦЫЙНЫЯ СТРАВЫ БЕЛАРУСКАЙ КУХНІ Ў ПАЭМЕ Я.КОЛАСА "НОВАЯ ЗЯМЛЯ"

У мэтах кансалідацыі грамадства, згуртавання беларускага народа на аснове ідэй суверэнітэту і незалежнасці краіны 2021 год у Беларусі аб'яўлены Годам народнага адзінства. Кожны народ мае свой характар, свае асаблівасці, якія адрозніваюць яго ад іншых народаў. Беларусы адрозніваюцца працавітасцю, талерантнасцю і гасціннасцю.

Сваё даследаванне мы прысвяцілі абрадава-святочным стравам беларускай нацыянальнай кухні, бо зацікавіліся гэтым пытаннем на ўроках беларускай літаратуры, калі чыталі паэму Я.Коласа "Новая зямля".

Мэта – вызначэнне асаблівасцей асартыменту абрадава-святочных страў беларускай нацыянальнай кухні, якія сустракаюцца на старонках паэмы Якуба Коласа "Новая зямля".

Задачы:

- раскрыць значэнне абрадава-святочных страў беларускай нацыянальнай кухні як важнага паказчыка гістарычнага мінулага беларускага народа;
- прааналізаваць раздзелы паэмы "Новая зямля" ("За сталом", "Каляды", "Пагляд пчол"), зрабіць класіфікацыю абрадава-святочных страў паводле іх кампанентаў;
- выявіць папулярнасць абрадава-святочных страў беларускай кухні сярод вучняў і настаўнікаў нашай гімназіі.